**ВОДЗЫЎ**

на аўтарэферат дысертацыі Шындлер Эліны Генадзьеўны
«Пластычны фальклор і фальклярызм
у сучасным народным мастацтве Беларусі»,
прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства
па спецыяльнасці 17.00.04 –
выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

Дысертацыйная работа Э. Г. Шындлер з'яўляецца комплексным даследаваннем працэсаў фальклярызацыі сучаснага народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Тэма дысертацыі адрозніваецца міждысцыплінарным характарам і ахоплівае пытанні мастацтвазнаўчай, культуралагічнай і гістарычнай накіраванасці. Для дасягнення пастаўленых задач аўтар выкарыстоўвае літаратурныя крыніцы розных навуковых дысцыплін на беларускай, рускай, польскай, нямецкай і ангельскай мовах, што надае дысертацыі Э. Г. Шындлер высокую ступень даставернасці. Багаты ілюстратыўны матэрыял (282 ілюстрацыі) наглядна пацвярджае вынікі праведзенага аналітычнага даследавання па вызначэнні ступені фальклярызаванасці сучаснага народнага мастацтва.

Дысертацыя Э. Г. Шындлер з'яўляецца ў айчынным мастацтвазнаўстве першым комплексным даследаваннем, прысвечаным вывучэнню працэсаў трансфармацыі мастацкай формы ў вырабах традыцыйнага мастацтва, а таму характарызуецца высокай ступенню навізны і адпавядае сучасным запытам грамадства. Неабходнасць размежавання адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фальклярызму ў сучасным народным мастацтве дыктуецца сучаснымі тэндэнцыямі: пашырэннем рынку тавараў у стылістыцы народных традыцый, праблемамі захавання этнічнай самабытнасці беларускай культуры ва ўмовах глабальнай уніфікацыі культур, разрывам пераемнасці традыцый паміж пакаленнямі.

Даследаванне з'яўляецца каштоўным навуковым унёскам і падмуркам для далейшай распрацоўкі праблемы фальклярызацыі сучаснай народнай творчасці. Удакладненне значэнняў базавых для галіны народнага мастацтва тэрмінаў і катэгорый, праведзенае аўтарам у рамках дысертацыі, павінна спрыяць больш яснаму разуменню сучасных працэсаў у галіне народнага мастацтва і павышэнню цікавасці да праблемы з боку даследчыкаў.

Для дасягнення пастаўленай мэты дысертацыі аўтар абапіраецца на комплекс агульнанавуковых і мастацтвазнаўчых метадаў даследавання: гісторыка-тэарэтычны, параўнальна-гістарычны, аналітычны, сістэмна-структурны, фармальна-стылістычны, іканаграфічны, метад інтэрвью, метад гістарычнай рэканструкцыі і метад эмпатыі. Апошні рэдка выкарыстоўваецца даследчыкамі, хаця менавіты яго ўжыванне надае работам у галіне народнага мастацтва высокую ступень даставернасці і значнасці навуковых вынікаў.

Распрацаваны Э. Г. Шындлер алгарытм размежавання адзнак пластычнага фальклору і пластычнага фальклярызму з'яўляецца ўнікальным і можа выкарыстоўвацца мастакамі і майстрамі народных рамёстваў для распрацоўкі мастацкай формы традыцыйных вырабаў з мэтай павышэння іх мастацкай якасці, гістарычнай даставернасці і культурнай вартасці.

Пастаўленыя дысертантам задачы вырашаны ў поўным аб'ёме ў трох главах даследавання і знайшлі адлюстраванне ў заключных высновах.

Аналітычны матэрыял дысертацыі можа выкарыстоўвацца для распрацоўкі навучальных праграм, метадычных дапаможнікаў, семінараў і лекцый па праблемах народнага мастацтва, а таксама для вырашэння шырокага кола творчых задач.

Вынікі даследавання даюць магчымасць сцвярджаць, што дысертацыя Шындлер Эліны Генадзьеўны «Пластычны фальклор і фалькларызм у сучасным народным мастацтве Беларусі» з'яўляецца самастойнай навуковай работай, аўтар якой заслугоўвае прысваення вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура.

Выказваю згоду на размяшчэнне водзыву на сайце ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

Кандыдат мастацтвазнаўства,
Настаўнік вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
ДУА «Дзіцячая школа мастацтваў № 3
г. Віцебска "Маладзік"» Я. У. Федарэц

22 мая 2024 г.

Подпись Я.В. Федорец верна
Директор ГУО „ДШИ № 3 г. Витебска
„Маладзік" О.Г. Сивцова